УДК 930.(476)

**_А.А. Савіч_**
_канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі славянскіх народаў_
_Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна_
e-mail: uleks@tut.by

# ЗАБАСТОВАЧНАЯ БАРАЦЬБА РАБОЧЫХ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ 1921–1939 гг. У АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ 1950-х – 1980-х гг.

_Разгледзены асноўныя навукова-метадалагічныя падыходы айчынных гісторыкаў да адлюстравання ў друку забастовачнай барацьбы ў Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. Аўтар раскрывае абумоўленасць акцэнтаў і фармулёвак пры падачы адпаведных пытанняў марксісцка-ленінскай метадалогіяй і палітыка-ідэалагічнымі прыярытэтамі савецкай улады. Апублікаваныя працы акцэнтавалі ўвагу на адмоўных рысах эканомікі Заходняй Беларусі, якія сталі прычынай рабочага руху і забастовачнай барацьбы. Стан і ўзровень забастовачнай барацьбы даследчыкі ставілі ў залежнасць ад актыўнасці Кампартыі Заходняй Беларусі (КПЗБ), аддаючы ёй ролю авангарда рэвалюцыйнага руху і галоўнага арганізатара забастовачнай барацьбы за паляпшэнне ўмоў працы і найму, за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. Дзейнасць іншых палітычных партый – апанентаў КПЗБ, якія дамінавалі ў рабочым руху, мэтанакіравана замоўчвалася і суправаджалася замацаваннем за імі ярлыкоў згоднікаў і здраднікаў інтарэсаў пралетарыяту. На падставе разнастайных крыніц, у першую чаргу архіўных матэрыялаў, ажыццяўляецца карэкціроўка і ўдакладненне адпаведных пазіцый, выяўляюцца аспекты, якія дазваляюць аб'ектывізаваць гісторыю забастовачнай барацьбы ў Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы міжваеннага перыяду._

## Уводзіны

Разгорнутая з другой паловы 1950-х гг. актыўная праца па вывучэнні і асвятленні ў друку гісторыі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі стымулявала аналіз пытанняў рабочага руху, у тым ліку забастовачнай барацьбы. Як партыя рабочага класа, якая ставіла сваёй канчатковай мэтай дыктатуру пралетарыяту, КПЗБ намагалася ўзначаліць рабочых Заходняй Беларусі ў іх барацьбе за паляпшэнне свайго становішча. Пры тым, што ў акрэслены адрэзак часу забастовачная барацьба заходнебеларускіх рабочых атрымала істотную ўвагу і адлюстраванне, гістарыяграфічныя аспекты тэмы не атрымалі прадметнага даследавання. Таму мэтай артыкула з'яўляецца крытычнае асэнсаванне працэсу развіцця гістарыяграфіі забастовачнага руху ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. з высвятленнем навукова-метадалагічных прыярытэтаў айчынных вучоных па асноўных паказчыках забастовачнага руху, яго абумоўленасці сацыяльна-палітычнымі і эканамічнымі аспектамі, характары і актыўнасці забастовак, іх колькасці, арганізацыі і ўдзелу ў гэтым руху розных палітычных сіл.

## Забастовачная барацьба ў Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. у асвятленні айчынных савецкіх аўтараў 1950-х– 1980-х гг.

Асноўныя метадалагічныя падыходы да асэнсавання характару, ролі і месца забастовачнага рабочага руху ў рэвалюцыйнай барацьбе ў Заходняй Беларусі былі акрэслены ў партыйным друку [1; 2, с. 46]. Адзначым, што ў параўнанні з перыядам развіцця гістарыяграфіі 1920-х – першай паловы 1950-х гг., калі пры разглядзе пытанняў рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі аўтары перабольшвалі яго стыхійнасць. У другой палове 50-х гг. ХХ ст. у гістарычнай літаратуры была прапанавана і абгрунтавана думка аб вядучай, авангарднай ролі КПЗБ у кіраванні забастовачным рухам [3, с. 52; 4, с. 73; 5, с. 68; 6, с. 46, 48; 7, с. 56–57].

Разважаючы аб рабочым руху ў перыяд 1921–1924 гг., І.В. Палуян і У.А. Палуян напрамую звязвалі стан забастовачнага руху з узмацненнем пазіцый кампартыі

ў прафсаюзах, што прыводзіла да пашырэння забастовачнага руху, прычым баставалі не толькі рабочыя буйных, але і дробных прадпрыемстваў. Забастовачны рух у перыяд пасляваеннага рэвалюцыйнага ўздыму найвышэйшага ўзроўню дасягнуў у 1923 г., калі ў заходнебеларускіх ваяводствах адбыліся 62 забастоўкі, якімі было ахоплена 177 прадпрыемстваў з 1 128 рабочымі [6, с. 48]. М.С. Арэхва ў калектыўнай манаграфіі прывёў іншыя лічбы, якія значна адрозніваюцца ад прыведзеных: у 1923 г. у 590 калектыўных канфліктах з прадпрымальнікамі ўзялі ўдзел 126 000 рабочых [7, с. 56]. Не дазваляе высветліць адпаведныя колькасныя паказчыкі і праца А.М. Мацко, які паказаў лічбы за кастрычнік 1923 г. у агульнапольскім маштабе: 400 тысяч забастоўшчыкаў [8, с. 73]. Сцвярджэнні аб пашырэнні забастовачнага руху ў сувязі з актывізацыяй кампартыі выклікаюць крытычныя разважанні, бо гаварыць пра трываласць пазіцый камуністаў у 1921–1923 г. не даводзіцца. КПЗБ была створана толькі ў канцы 1923 г., а да гэтага ў заходнебеларускіх гарадах, у прыватнасці, Брэсце, існавалі ідэйна і нацыянальна разрозненыя камуністычныя дзеячы і невялічкія ячэйкі [9, арк. 22–23, 25–27]. Увогуле на працягу ўсяго перыяду 1921–1939 гг. камуністы так і не змаглі ўзначаліць рабочы рух, пацягнуць за сабой большасць рабочых, якія традыцыйна ішлі за ППС, Бундам, а таксама за праўрадавымі прафсаюзамі.

Адзначым, што прыведзеныя аптымістычныя сцверджанні сфарміраваны насуперак праігнараваным непрыемным для камуністаў выпадкам, якія мелі месца ў рабочым руху. Партыйнае кіраўніцтва, у тым ліку і згаданы ўжо як даследчык М.С. Арэхва, пра іх ведала з рэгулярных справаздач з «крэсаў». Так, справаздача ЦК КПЗБ за чэрвень 1925 г., змяшчаючы інфармацыю аб становішчы ў Заходняй Беларусі і рабочым руху, канстатавала несуцяшальную для партыйнага кіраўніцтва сітуацыю: «Што тычыцца рабочых мас, то сярод іх вялікая апатыя. Асабліва характэрна гэта ў Беластоку». Нягледзячы на некаторыя поспехі, «зрушыць масу на якую-небудзь кампанію вельмі цяжка. Рабочыя пабойваюцца. У прафсаюзы ідуць неахвотна, і гэта звязана з рэпрэсіямі». Даклад за ліпень таго ж года аб стане КПЗБ таксама не мог дабавіць партыйным функцыянерам аптымізму, бо «настрой рабочых мас у сваёй большасці пасіўны, …агульную апатыю разбіць нельга. Асобныя выпадкі выйграных забастовак не ў стане ўскалыхнуць усёй рабочай масы. Боязь страціць месца прымушае рабочых чэпка трымацца сваіх месцаў» [10, арк. 13, 14, 17].

На фоне поспехаў арганізацыі антыпольскага руху ў сельскай мясцовасці, калі вяскоўцы масава ўступалі ў Грамаду і так ці інакш удзельнічалі ў барацьбе, з гарадскімі рабочымі былі вядомыя цяжкасці, ілюстрацыяй чаго была згаданая інфармацыя аб уплыве на прафсаюзы рабочых. І.В. Палуян і У.А. Палуян справядліва лічылі, што забастовачны рух рабочых у 1926 г. адставаў ад узроўню палітычнай барацьбы ў краі і тлумачылі гэта ажыўленнем прамысловай вытворчасці ва ўмовах стабілізацыі, а таксама адсутнасцю адзінства рабочага руху і раскольніцкай работай згодніцкіх партый [6, с. 103]. А.М. Мацко да гэтага дадае «суровыя паліцэйскія рэпрэсіі», пагаджаецца з тым, што ў 1926 г. забастовачная барацьба значна аслабла [8, с. 106, 113]. Аўтары калектыўнай манаграфіі гаварылі пра слаба арганізаваны і «распылены» рабочы рух. Аднак, нягледзячы на гэта, каб выправіць хоць на старонках навуковых выданняў відавочна блеклы вобраз гегемона рэвалюцыі, гісторыкі вымушаны былі прыводзіць уяўныя поспехі, якія сталі вынікам актыўнай агітацыйнай працы, калі адным з найважнейшых момантаў барацьбы КПЗБ і Грамады за стварэнне адзінага фронту рабочага класа стала змаганне за легальныя арганізацыі рабочых: прафесійныя саюзы, бальнічныя касы, страхавыя суполкі [7, с. 165–166].

Паводле партыйных справаздач, няма падстаў гаварыць пра безумоўны аўтарытэт кампартыі сярод рабочых у сярэдзіне 1920-х гг., у тым ліку ў Беластоку, дзе першапачатковыя поспехі камуністаў былі спынены масавымі арыштамі актывістаў КПЗБ,

а некаторыя з іх актыўна супрацоўнічалі са следствам, выдавалі яўкі, паролі, кіраўніцтва партыі [11, арк. 35–41; 12, арк. 24]. Напрыклад, сакратар Беластоцкага акруговага камітэта, член ЦК КПЗБ Ян Богдан, адзін з камуністычных прафсаюзных правадыроў, які карыстаўся «вялікім аўтарытэтам сярод беластоцкіх рабочых», выдаў члена цэнтральнага камітэта Л.Н. Аранштама, кіраўніка нелегальнай ваеннай арганізацыі КПЗБ. Пасля арышту і супрацоўніцтва са следствам Я. Богдан спыніў удзел у дзейнасці кампартыі і актыўна працаваў у прафсаюзах, непадкантрольных КПЗБ [12, арк. 24; 13, арк. 2–4].

Несуцяшальныя для КПЗБ прыклады адзначаліся і ў іншых партыйных і прафсаюзных арганізацыях. Гэта пацвярджае, у прыватнасці, рэзалюцыя ЦК КПЗБ па дакладзе аб дзейнасці Віленскага акруговага камітэта, якая адзначыла слабую палітычную актыўнасць гарадскіх арганізацый Вільні і Ліды, недастатковы ўдзел камуністаў у эканамічнай барацьбе рабочых: партыя «не прымае ніякага ўдзелу ў канфліктах» [14, арк. 68]. Хутчэй за ўсё, гэта можна патлумачыць «паглынаннем» камуністаў аграрна-сялянскай праблематыкай, якая дыктавалася грамадоўскімі актывістамі і паступова выводзіла партыйцаў з гарадоў у бурлівую вёску.

Жаданне гісторыкаў падвесці наяўныя колькасныя паказчыкі рабочага руху пад прынятую канцэпцыю нацыянальна-вызваленчага руху прыводзіла да відавочных разыходжанняў. І.В. Палуян і У.А. Палуян сцвярджалі, што ў перыяд г.зв. апошніх гадоў адноснай стабілізацыі капіталізму (красавік 1927 г. – май 1929 г.) рэвалюцыйны і нацыянальна-вазваленчы рух у Заходняй Беларусі хоць і быў больш слабым, чым у 1926–1927 гг., але дасягнуў значнай вастрыні і сілы. Забастовачны рух рабочых нават некалькі ўзрос у параўнанні з 1926 г., баявы і наступальны характар многіх стачак сведчыў аб уздыме забастовачнага руху, які бачна ажывіўся, як адзначалі даследчыкі [6, с. 130; 7, с. 167; 8, с. 129]. Адметнасць гэтага перыяду даследчыкі бачылі ў тым, што барацьба вялася галоўным чынам за захаванне і ўмацаванне саюза рабочых і сялян, захаванне наяўных і стварэнне новых масавых легальных арганізацый працоўных, падтрыманне хаця б на ранейшым узроўні рэвалюцыйнага нацыянальна-вызывленчага руху, актывізацыю рабочага руху. Агульным, на думку даследчыкаў, што аб’ядноўвала рэвалюцыйны рух тых гадоў з рэвалюцыйным рухам 1925–1926 гг., з’яўлялася існаванне і легальная дзейнасць дэмакратычных арганізацый «Змаганне» і ТБШ, значнае распаўсюджванне легальных форм дзейнасці кампартыі ў масах, у тым ліку ў асяродку рабочых. Відавочна, што тут аўтарам не хапіла дакладнасці ў тым, каб разабрацца, што ўяўляе сабой рэвалюцыйны рух, а што нацыянальна-вызваленчы, як яны суадносяцца паміж сабой. Гэта з улікам ужо адзначаных асаблівасцей гарадскога насельніцтва, у якім колькасная перавага была на баку прадстаўнікоў яўрэйскай нацыянальнасці, якія хоць і кантактавалі з КПЗБ, але забяспечыць рэвалюцыйнасць не маглі. Да таго ж забастовачны рух рабочых мог развівацца без узаемасувязі з заходнебеларускім нацыянальна-вызваленчым рухам і слаба быць залежным ад «Змагання» і ТБШ, як раней і ад БСРГ.

Аднак на старонках публікацый штучна ствaралася ўражанне аб дачыненні кампартыі да ўсіх праяваў рабочага руху, сцвярджалася, што пераважная большасць стачак заканчвалася поўнай ці частковай перамогай рабочых, а ў авангардзе барацьбы пралетарыяту ішлі камуністы, што забастоўкі гэтага перыяду насілі масавы, часта наступальны з боку рабочых характар, многія «стачкі былі вельмі ўпартымі, працягваліся некалькі месяцаў», «рабочыя вялі барацьбу не толькі за павышэнне заработнай платы, але і выстаўлялі палітычныя патрабаванні», у ходзе забастовачнай барацьбы ўмацоўваўся рабоча-сялянскі саюз, аб чым сведчыла матэрыяльная дапамога сялян бастуючым рабочым [7, с. 166–168, 188–190; 8, с. 130, 132–133].

Колькасныя паказчыкі забастовачнага руху 1927–1928 гг. таксама неаднолькавыя ў падачы розных аўтараў. Так, І.В. Палуян і У.А. Палуян 1928 г., разам з 1923 г., выдзелілі як самы высокі ў 1920-я гг. па ўзроўні развіцця забастовачнага руху ў Заход-

няй Беларусі. Калі ў 1927 г. у заходнебеларускіх ваяводствах адбылося 37 забастовак, то ў 1928 г. – 55, а ў 1929 г. – 49. Амаль у 2 разы (з 10 у 1927 г. да 18 у 1928 г.) вырасла колькасць больш буйных забастовак, у якіх удзельнічала адразу некалькі прадпрыемстваў. Колькасць прадпрыемстваў, ахопленых забастоўкамі, павялічылася з 210 у 1927 г. да 435 у 1928 г. [6, с. 130]. А.М. Мацко, суаўтар калектыўнай манаграфіі, у сваіх выданнях падаў іншыя лічбы, якія значна адрозніваюцца: у 1927–1928 гг. у чатырох заходнебеларускіх ваяводствах адбылося 370 забастовак з удзелам каля 49 тыс. рабочых [7 с. 167; 8, с. 129].

У савецкай гістарычнай традыцыі перыяд першых гадоў сусветнага эканамічнага крызісу характарызаваўся ажыўленнем рабочага руху ў Заходняй Беларусі, якое падрыхтавала рэвалюцыйны ўздым у наступныя два гады. Даследчыкі адзначалі найбольш буйныя выступленні рабочых у 1929 г.: забастоўкі 700 рабочых шклозавода «Нёман» Лідскага павета, 700 рабочых Гродзенскага шклозавода, 150 рабочых-краўцоў Брэста, пекараў Пінска, рабочых лесапільнага завода «Панемунь» у Гродне і інш. Прычыны гэтых забастовак былі эканамічныя і, даводзілі вучоныя, як правіла заканчваліся задавальненнем патрабаванняў бастуючых, некаторымі кіравалі акружкамы і гаркамы КПЗБ [7, с. 211–214; 15, с. 52]. Аднак адпаведныя каноны даследавання пытанняў рабочага руху патрабавалі ад аўтараў кваліфікаваць забастовачную эканамічную барацьбу рабочых як рэвалюцыйную [15, с. 48, 50]. Забастоўкі 1930 г., па сцвярджэнні гісторыкаў, насілі, як і ў 1929 г., у большасці эканамічны характар. Пад кіраўніцтвам партыйных ячэек прафарганізацыі рупліва рыхтавалі амаль кожную стачку, таму і большым быў адсотак забастовак, якія заканчваліся перамогай рабочых. Так, прысутнасць камуністаў у забастоўках аўтаматычна прыводзіла да тэзіса аб рэвалюцыйнасці і палітызаванасці рабочага руху [7, с. 212, 213, 214; 8, с. 174–176; 15, с. 52, 55].

Прынятая і шматразова паўтораная гісторыкамі думка аб кіраўніцтве рабочым рухам КПЗБ у гады сусветнага эканамічнага крызісу абвяргаецца наяўнымі архіўнымі матэрыяламі. На сумесным пасяджэнні ЦК КПЗБ і Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры КП(б)Б 19 верасня 1931 г. было канстатавана «адставанне актыўнасці партыі ад росту актыўнасці мас… Важнейшыя забастоўкі прайшлі без кіраўніцтва нашай партыі, міма кіраўніцтва нашай партыі, а ў некаторых месцах нават без ведама партыі. У гэтым накірунку трэба біць трывогу». Сітуацыя для камуністаў трывожная, бо партарганізацыя ў Беластоку «разгубілася», у Гродне «забастовачны стан яшчэ горшы. …Цэлы шэраг забастовак …таксама прайшоў міма партыі». Асабліва непрыемным для партыйнага кіраўніцтва было тое, што на фоне пасіўнасці КПЗБ іншыя партыі мелі папулярнасць і аўтарытэт у рабочых, пашырылі свой уплыў у прафсаюзах, арганізавалі шэраг буйных забастовак так, што «важнейшыя забастоўкі праходзілі пад кіраўніцтвам сацыял-фашызму» [13, арк. 2–5]. Аднак у публікацыях знаходзім адваротнае. Стваралася ўражанне паступальнасці ў авалодванні камуністамі рабочага руху: ў перыяд 1932–1933 гг. адбылося пашырэнне рабочага руху, КПЗБ у гэты час значна часцей удаваласяператвараць эканамічныя забастоўкі ў палітычныя выступленні [7, с. 213, 246; 16, с. 13, 17].

Найбольшай увагі даследчыкаў рабочага руху прыцягнулі апошнія гады сусветнага эканамічнага крызісу. Асноўныя сюжэты гэтых падзей былі выкладзены І.В. Палуянам у артыкуле 1959 г., у якім асветлены праявы забастовачнага руху рабочых лясных промыслаў Белавежскай пушчы. Асноўныя падзеі пададзены па схеме, якая прадугледжвала прычынай забастоўкі нечуваную эксплуатацыю з боку «фашысцкага надлясніцтва» (вельмі нізкая заработная плата) як часткі «ўсёй сістэмы жорсткага эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага і нацыянальнага прыгнёту, якому падвяргаліся працоўныя Заходняй Беларусі»; усенародны характар барацьбы – уключэнне ў барацьбу супраць прыгнёту разам з рабочымі лясных промыслаў і возчыкаў, сязонна занятых на вывазцы лесу; рэвалюцыйны парыў рабочых лясных промыслаў, «якімі, як і ўсёй барацьбой пра-

цоўных Заходняй Беларусі», кіравала кампартыя. Імкненне падаваць барацьбу рабочых за эканамічныя інтарэсы як рэвалюцыйны рух стала характэрнай рысай гістарыяграфіі рабочага руху. Відавочныя праявы чыста эканамічных выступленняў, звязаных з патрабаваннем павышэння зарплаты, паляпшэння ўмоў найму і працы без належнага абгрунтавання факталагічнага характару кваліфікаваліся як рэвалюцыйныя выступленні. Своеасабліва былі патлумачаны і прычыны спаду рэвалюцыйнага руху рабочых лясных промыслаў: адсутнасць неабходнага адзінства ў выступленнях саміх рабочых і належнай падтрымкі іх з боку сялянства, жорсткі паліцэйскі тэрор, здрада інтарэсам рабочых кіраўніцтвам ППС, Бунда, якія дапамаглі польскім уладам у шэрагу выпадкаў ашукаць і раскалоць рабочых, сарваць іх выступленні, часовае агульнае паслабленне рэвалюцыйнага руху ва ўмовах уступлення Польшчы ў паласу дэпрэсіі. Пры гэтым даследчык аптымістычна гаварыў пра забастовачны рух рабочых лясных промыслаў як сведчанне таго, што «і гэты распылены атрад рабочага класа, які складаўся ў асноўным з беззямельных і малазямельных сялян, узняўся да арганізаваных форм класавай пралетарскай барацьбы» [17].

Іншыя публікацыі канцэптуальна ішлі ў азначаным рэчышчы: падкрэслівалася, што ў 1932–1933 гг. пад кіраўніцтвам КПЗБ у непарыўнай сувязі з рабочым рухам разгортвалася рэвалюцыйная барацьба сялянскіх мас Заходняй Беларусі. Гэта называлася асноўнай прычынай перамог рабочых у забастовачнай барацьбе. Рабочыя пад кіраўніцтвам камуністаў «вялі непрымірымую барацьбу» супраць правых кіраўнікоў рэфармісцкіх прафсаюзаў, «згоднікаў» з вярхушкі ППС [6, с. 168–169; 7, с. 245–247; 8, с. 49, 93]. Гісторыкі з захапленнем разважалі пра поспехі КПЗБ у Беластоку ў 1932 г. па наладжванні кантактаў у рабочым асяродку, арганізацыі забастовак, у тым ліку сярод тэкстыльшчыкаў, згадвалі актыўную дзейнасць акруговага і гарадскога камітэтаў КПЗБ [7, с. 248–251]. Але гэтая інфармацыя не стыкуецца са справаздачамі камуністычных функцыянераў Беласточчыны, якія паведамлялі ў Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пра згаданага вышэй Я. Богдана як кіраўніка легальнага Беластоцкага саюза тэкстыльшчыкаў, які кіраваў у 1931 г. забастоўкай тэкстыльшчыкаў і ўзняў аўтарытэт «сацыял-фашызму» і свой уласны [13, арк. 4]. Да таго ж, паводле інфарматара КПЗБ з Беластока, на 5 чэрвеня 1932 г. Беластоцкага акруговага і гарадскога камітэтаў «фактычна не існуе, ячэйкі не збіраюцца. Няма ўцягнення ўсёй арганізацыі ў працу» [19, арк. 4]. Атрымліваецца, што актывізацыя рабочага руху, якая адбывалася дзякуючы дзейнасці легальных прафесійных саюзаў і палітычных партый, беспадстаўна прыпісвалася кампартыі. Дзейнасць жа сапраўдных арганізатараў рабочага руху, у першую чаргу ППС і Бунда, на старонках цытаваных публікацый называлася «здрадай інтарэсам рабочых кіраўніцтва ППС і Бунда» [6, с. 168–169].

Адпаведныя выказванні суправаджаліся статыстычнымі звесткамі пра колькасць забастовак. Як і ў дачыненні да ранейшых перыядаў, і па крызісных гадах лічбы значна адрозніваюцца: некаторыя даследчыкі падалі інфармацыю пра забастоўкі і стачкі, якія савецкая гістарыяграфія адрознівала, маецца інфармацыя пра палітычныя стачкі і акупацыйныя забастоўкі [7, с. 213, 279; 8, с. 173, 181, 188, 190; 18, с. 51; 20, с. 89; 21, с. 44; 22, с. 56–57]. Відавочна, што для гісторыкаў устанаўленне больш дакладных лічбаў не было прыярытэтам, яны былі своеасаблівым інструментам для стварэння карціны ўсеагульнага ўздыму рабочага класа пад кіраўніцтвам кампартыі супраць «эксплуататараў». Што да «ўзрослай» палітычнай актыўнасці рабочых у час забастоўкі, то тут неабходна мець на ўвазе тактыку КПЗБ, якая дзеля радыкалізацыі выступленняў, арганізаваных легальнымі прафсаюзамі з актыўным удзелам легальных партый, у першую чаргу ППС і Бунда, часам мэтанакіравана абвастрала ход забастоўкі, праз радыкальныя патрабаванні ў духу камуністычнай прапаганды і шчыра правакацыйныя дзеянні ішла

на адкрытую канфрантацыю з прадстаўнікамі ўлады, не адмаўляючыся ад прымянення зброі пры сутычках з паліцыяй.

Пытанні разгортвання рабочага руху ў перыяд 1934–1939 гг. на старонках навуковых публікацый звязваліся з агульнай барацьбой працоўных Заходняй Беларусі пад кіраўніцтвам КПЗБ «супраць фашысцкай дыктатуры і падрыхтоўкі новай вайны, за стварэнне адзінага рабочага і антыфашысцкага народнага фронту». Даследчыкі выказалі думку, што рэвалюцыйны рабочы рух, як і ўвогуле рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі, у цэлым быў слабейшым, чым у перыяд рэвалюцыйнага ўздыму 1932–1933 гг. Ён не быў падтрыманы шырокімі выступленнямі сялянства. Прычыну гэтага гісторыкі бачылі ў цяжкіх палітычных умовах у краіне ў сувязі з узмацненнем рэакцыі, падрыхтоўкі да вайны; «масавыя рэпрэсіі і паліцэйскі тэрор у адносінах да камуністаў і рэвалюцыйна настроеных рабочых і сялян» абмяжоўвалі магчымасць работы кампартыі сярод мас, «заадно з урадам дзейнічалі і беларускія буржуазныя нацыяналісты, якія поўнасцю падтрымлівалі палітыку польскага буржуазнага ўраду, у іх асяродку ўсё больш узмацняліся фашысцкія тэндэнцыі» [6, с. 217; 7, с. 319; 8, с. 272]. Так, у традыцыйным стылі беларускія палітычныя сілы падаваліся большымі ворагамі, чым іншыя «буржуазныя нацыяналісты» – ППС, Бунд, Паалей-Цыён і інш. Прычынай гэтага было рашучае адмаўленне, у прыватнасці, БХД-БНА, ад супрацоўніцтва з КПЗБ у рамках адзінага фронту. Тады камуністы рэзка ўзмацнілі сваю крытыку «белбурнацаў», а савецкія гісторыкі да пачатку 1990-х гг. працягвалі лаяць беларускіх дзеячаў, якія, адмаўляючыся ад супрацоўніцтва, мелі на ўвазе трагічныя падзеі калектывізацыі, барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам, палітычных рэпрэсій у БССР.

Разважанні пра аслабленне рэвалюцыйнага рабочага руху стваралі ўражанне зніжэння актыўнасці рабочых у барацьбе за свае эканамічныя і палітычныя правы, якую яны праводзілі пад сцягамі ППС, Бунда і іншых палітычных сіл. Аднак, як паказвае даследаванне М.Б. Сямёнчыка, «2-я палова 1935 – 1939 гг. былі часам найбольш высокага ўздыму рабочага руху. Сярэднегадавая колькасць забастовак у параўнанні з 1925–1935 гг. узрасла ў 2–3 разы, быў дасягнуты і перавышаны паказчык 1923 г.» [23, с. 100]. На гэтым фоне сцвярджэні савецкіх гісторыкаў пра панаванне «жорсткага санацыйнага рэжыму» і «фашысцкай» канстытуцыі 1935 г. відавочна бачацца надзвычай тэндэнцыйнымі і заідэалагізаванымі.

Нават аслабленне кампартыі ў сярэдзіне 1930-х гг. у выніку жорсткага ціску на яе з боку польскай улады і палітычных кампаній у СССР і роспуску КПП не спыняла гісторыкаў перад жаданнем сцвярджаць значную прысутнасць КПЗБ у рабочым руху сярэдзіны – другой паловы 1930-х гг. Гэта вынікала з праяў узаемадзеяння кампартыі з былымі зацятымі апанентамі – ППС, Бундам, якія ў гэты час дабіліся значных поспехаў у аваладванні рабочым рухам і дапускалі супрацоўніцтва з камуністамі. Гэта не пазбавіла абвінавачвання гэтых партый і іх кіраўнікоў на старонках выданняў у раскольніцтве, здрадзе рабочым, згодніцтве і прыслужніцтве буржуазіі, сектанцтве і прасіянізме [7, с. 313–314; 8, с. 244; 24, с. 43]. Згадка кампартыі ў кантэксце арганізацыі забастовачнага руху, у якім камуністы былі аўтсайдарамі, дазваляла гаварыць пра іх папулярнасць [7, с. 302–305; 20, с. 229; 24, с. 35–36, 97–99]. Аднак, маючы на ўвазе прыведзеныя паказчыкі, паставімся да іх крытычна: аслабленыя паліцэйскімі акцыямі ў Польшчы і рэпрэсіўнымі дзеяннямі ў БССР, структуры КПЗБ не маглі мець прыпісанага ім беларускімі савецкімі гісторыкамі значэння і поспехаў у забастовачнай барацьбе.

**Заключэнне**

Такім чынам, у другой палове 1950-х – 1980-я гг. гісторыкамі была праведзена значная праца па вывучэнні забастовачнага руху ў Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. Гэты працэс вызначаўся спецыфікай метадалагічных падыходаў. Згодна з марксісцка-ле-

нінскай метадалогіяй рабочаму класу як гегемону рэвалюцыйнага руху народных мас адводзіліся асобнае месца і роля ў забастовачнай барацьбе. Рабочыя выступленні, акрамя гэтага, з'яўляліся падставай для актывізацыі сялянскага руху. У працах даследчыкаў прасочвалася схільнасць да перабольшвання ўзроўню забастовачнага руху, калі да рэвалюцыйнай барацьбы адносіліся выступленні эканамічнага характару, напрыклад, забастоўкі рабочых за паляпшэнне ўмоў працы і павышэнне заработнай платы.

Неабходна крытычна ставіцца да сцвярджэння аб кіруючай ролі КПЗБ у забастовачным руху. Наяўныя архіўныя дакументы аб сітуацыі ў Заходняй Беларусі і становішчы партыі красамоўна гавораць аб слабасці партыйных арганізацый і іх пазіцый у рабочым асяродку, канстатуюць, што выступленні рабочых часта адбываліся без удзелу КПЗБ, і, наадварот, падкрэсліваюць кіруючую ролю «згодніцкіх» партый, да якіх даследчыкі адносілі ППС, Бунд, Паалей-Цыён і іншыя.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. К вопросу об истории Коммунистической партии Западной Белоруссии // Коммунист Белоруссии. – 1957. – № 8. – С. 25–36.

2. Савіч, А. А. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гады): гістарыяграфія праблемы : манаграфія / А. А. Савіч ; навук. рэд. А. А. Каваленя. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2012. – 288 с.

3. Царюк, И. О. КПЗБ в борьбе за интернациональное воспитание трудящихся (1929–1933 гг.) / И. О. Царюк // Сб. науч. работ БГУ им. В. И. Ленина. – Минск, 1958. – Вып. 1 (40). – С. 39–59.

4. За правильное освещение истории Компартии Западной Белоруссии // Коммунист. – 1964. – № 8. – С. 68–79.

5. Глинская, Т. Ю. КПЗБ – руководитель освободительной борьбы трудящихся Западной Белоруссии. 1924–1928 гг. / Т. Ю. Глинская. – Минск : Беларусь, 1965. – 200 с.

6. Полуян, В. А. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920–1939 гг. / В. А. Полуян, И. В. Полуян. – Минск : Госиздат, 1962. – 222 с.

7. Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921–1939 гг.) / А. Н. Мацко [и др.] ; под ред. А. Н. Мацко и В. Е. Самутина. – Минск : Беларусь, 1966. – 403 с.

8. Мацко, А. Н. Революционная борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против гнета буржуазии и помещиков (1918–1939 гг.) / А. Н. Мацко. – Минск : Беларусь, 1972. – 335 с.

9. Переписка секретного отдела Центрального Бюро КП(б) Белоруссии с (уполномоченным отдела в Бресте) о положении в Брестской организации КП(б)Б (17.02. – 17.07.1921 г.) // Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 242п. Оп. 2. Д. 12.

10. Месячные отчеты ЦК Компартии Западной Белоруссии (1925 г.) // НАРБ. – Ф. 242п. Оп. 2. Д. 61.

11. Сообщения и рапорта полицейских об общественно-политическом движении на территории Полесского воеводства // Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 92. Оп. 1. Д. 130.

12. Письма (советников НКИД) Ульянова и Загорного из Варшавы в Представительство компартии Западной Белоруссии о работе Компартии Западной Белоруссии, о распространении литературы, по финансовым и другим вопросам // НАРБ. – Ф. 242п. Оп. 2. Д. 86.

13. Отчеты, резолюции, информации и письма ЦК КПЗБ и переписка краевого бюро ЦК КПЗБ с Представительством и округами о положении в КПЗБ // НАРБ. – Ф. 242п. Оп. 1. Д. 47.

14. Резолюции и письма ЦК КПЗБ и материалы II конференции КПЗБ // НАРБ. – Ф. 242п. Оп. 1. Д. 12.

15. Палуян, І. В. Рабочы рух у Заходняй Беларусі ў 1929–1931 гг. / І. В. Палуян // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1960. – № 1. – С. 44–55.

16. Ховратович, И. П. КПЗБ – руководитель борьбы трудящихся Западной Белоруссии за свое социальное и национальное освобождение в период мирового экономического кризиса (1929–1933 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / И. П. Ховратович ; Ин-т истории партии при ЦК КПБ. – Минск, 1966. – 22 с.

17. Палуян, І. В. Рэвалюцыйны рух рабочых лясных промыслаў Заходняй Беларусі ў 1932–1934 гг. / І. В. Палуян // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1959. – № 2. – С. 69–79.

18. Воткович, Г. Б. Деятельность Компартии Западной Белоруссии по пропаганде социалистического строительства в СССР (1929–1933 гг.) / Г. Б. Воткович // Весн. БДУ. Сер. 3, Гісторыя. Эканоміка. Права. – 1973. – № 1. – С. 3–9.

19. Отчеты, информации, письма и материалы опроса работников Белостокского округа о состоянии работы партийных организаций, о забастовке лесных рабочих и др. // НАРБ. – Ф. 242п. Оп. 1. Д. 426.

20. Клейн, Б. С. За дело правое. Борьба КПЗБ с буржуазным террором / Б. С. Клейн. – Минск : Беларусь, 1986. – 175 с.

21. Зелинский, П. И. Политическая работа Коммунистической партии Западной Белоруссии в массах, 1923–1938 / П. И. Зелинский. – Минск : Университетское, 1986. – 136 с.

22. Ладысев, В. Ф. В борьбе за демократические права и свободы. Из исторического опыта Компартии Западной Белоруссии. 1926–1938 гг. / В. Ф. Ладысев. – Минск : Беларусь, 1988. – 189 с.

23. Сямёнчык, М. Б. Рабочы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.02 / М. Б. Сямёнчык. – Мінск, 2000. – 139 л.

24. Ладысеў, У. Ф. КПЗБ – арганізатар барацьбы працоўных за дэмакратычныя правы і свабоды (1934–1938) / У. Ф. Ладысеў. – Мінск : БДУ, 1976. – 168 с.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 30.06.2017

***Savich A.A.*** **Strike Movement of Workers of Western Belarus in 1921–1939 in Domestic Historiography of the Second Half of the 1950s–1980s**

*The research reflects the main scientific and methodological approaches of domestic historians to the reflection in the press of the strike movement in Western Belarus in 1921–1939. The author reveals the conditionality of accents and formulations when submitting relevant questions to the Marxist-Leninist methodology and the political and ideological priorities of the Soviet government. Published works drew attention to the negative features of the economy of Western Belarus, which led to the labor movement and strike action. The researchers assessed the state and level of the striking struggle as a function of the activity of the CPWB, giving it the role of the vanguard of the revolutionary movement and the main organizer of the striking struggle for better working and recruitment conditions, and for social and national liberation. The activities of other political parties, opponents of the CPWB, which dominated the labor movement, were deliberately hushed up and accompanied by the labeling of them as conciliators and traitors to the interests of the proletariat. Based on various sources, primarily archival materials, corrections and clarification of the corresponding positions are being carried out, aspects have been identified that make it possible to objectify the history of the striking struggle in Western Belarus as part of Poland in the interwar period.*